Партыйнае жыццё: партрэт сакратара

Старасць мяне дома не застане...

Як і заўсёды, справаздачна-выбарны сход калгаса праходзіў у лютым. Выступалі старшыня гаспадаркі І. З. Майдзін, даяркі, начальнікі вытворчых участкаў, механізатары...

Намеснік старшыні калгаса Алена Аляксееўна Скрабатун сядзела ў прэзідыуме і ўважліва ўслухоўвалася ў тое, што гаварылася з трыбуны.

Так, сапраўды, вынікамі года можна радавацца. Выкананы планы па ўсіх сельскагаспадарчых культурах, акрамя, бадай, ільну... Нядрэнна ідуць справы і ў жывёлагадоўлі: па 3258 кілаграмаў малака ад кожнай каровы надаілі летась. Паспяхова забяспечаны план продажу дзяржаве мяса. Але, нягледзячы на тое, што калгас «Парыжская камуна» пастаянна хваляць, лічаць адным з лепшых у раёне, усё ж дасягнутае нельга лічыць мяжой. Аб гэтым трэба памятаць заўсёды. І не толькі памятаць, але і дзейнічаць! Таптацца на месцы ніхто не мае права, не па-партыйнаму гэта...

Наперадзе ж так многа спраў. Трэба закончыць работу па абнаўленню дойнага статка, якая пакуль што праведзена не на ўсіх фермах былога калгаса «За мір», які год назад увайшоў у склад «Парыжскай камуны». Больш трэба нарыхтоўваць арганічных угнаенняў, а для гэтага неабходна прапусціць праз жывёлагадоўчыя памяшканні як мага больш тарфакрошкі. Наспела неабходнасць правядзення ў нізкіх месцах ля вёсак Канахі, Табары меліярацыйных работ. Вялікія задумы на будучае і па будаўніцтву. Трэба праводзіць рэканструкцыю жывёлагадоўчых памяшканняў, узводзіць жыллё. Плануецца таксама пабудаваць у вёсцы Пад'ельцы свой Дом культуры з глядзельнай залай на 500 месц. Там жа размесціцца і плавальны басейн...

Так, задумы вялікія. Шкада толькі, што не ўсе з іх давядзецца Алене Аляксееўне ажыццяўляць. Узрост ужо не той... І так яна каля 10 гадоў працуе, знаходзячыся на заслужаным адпачынку.

...Так, імкліва бяжыць час. Здаецца, толькі нядаўна Алена Аляксееўна разам з бацькамі і сёстрамі жыла ў лясной вёсачцы Хралы на Глыбоччыне, бегала ў школу, дапамагала старым па гаспадарцы. І, вядома ж, марыла аб будучым.

Але яе дзявочым спадзяванням не суджана было збыцца. Мірную працу людзей перапыніла вайна. І ў хуткім часе ў іх лясной вёсачцы ўсе, хто мог трымаць зброю ў руках, уліліся ў рады народных мсціўцаў. Стала партызанкай і Алена Аляксееўна. Спачатку была сувязной, а потым і на баявыя заданні давялося хадзіць.

Жорстка адпомсцілі фашысты сяльчанам за сувязь з партызанамі: ушчэнт спалілі іх вёску, знішчылі многіх мірных жыхароў. У ліку ахвяр акупантаў аказаўся і бацька Алены Аляксееўны...

А пасля не менш цяжкія гады аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі. Не давялося А. А. Скрабатун закончыць сярэднюю школу, як марыла аб гэтым да вайны. Пасля заканчэння двухмесячных курсаў у раённым цэнтры яе накіравалі працаваць сакратаром сельскага Савета ў суседнюю вёску Каралевічы. Нялёгка было пачынаць. Стары малапісьменны вясковы дзядзька, які з'яўляўся старшынёй, і яна, зусім маладзенькая дзяўчынка ў якасці сакратара — вось, бадай, і ўвесь штат сельскага Савета тых часоў. А нагрузка на іх плечы лягла не такая ўжо і малая. Трэба было забяспечваць пастаўкі дзяржаве прадукцыі сельскай гаспадаркі, выконваць планы па фінансавых падатках, адбываць гужавую павіннасць, распаўсюджваць аблігацыі дзяржаўнай пазыкі... Калгасаў жа ў той час не было, і сельскі Савет з'яўляўся адзіным органам Савецкай улады на вёсцы, а таму яго работнікі павінны былі праводзіць вялікую прапагандысцкую і растлумачальную работу сярод мясцовага насельніцтва.

Не заўсёды ўсё ўдавалася. Былі зрывы, перашкод на шляху работнікаў сельскага Савета сустракалася не так ужо мала. Навокал жа разгарнулі сваю дзейнасць банды з фашысцкіх недабіткаў, дэзерціраў, якія з усіх сіл стараліся перашкодзіць устанаўленню Савецкай улады на вёсцы. І таму сельскі Савет увесь час ахоўвалі хлопцы - малалеткі, так называемыя «страпкі». Менавіта яны і сталі першымі членамі камсамольскай арганізацыі ў сельскім Савеце, арганізатарам якой, а затым і сакратаром была Алена Аляксееўна Скрабатун.

Так, на розных пасадах давялося працаваць у той нялёгкі час ініцыятыўнай, гарачай да справы дзяўчыне. Была інструктарам райкома камсамола (дарэчы, менавіта тут яна ўступіла ў члены КПСС), а затым, пасля таго, як выйшла замуж, зноў прыйшлося працаваць сакратаром сельскага Савета ў той жа вёсцы, дзе пачалася яе працоўная біяграфія.

У 1950 годзе Алену Аляксееўну вылучаюць на пасаду старшыні сельскага Савета. І ўсюды, якую б справу жанчыне ні даручалі, за яе яна бралася з агеньчыкам, старалася зрабіць па-партыйнаму, добрасумленна. Яе працавітасць, няўрымслівасць не засталіся незаўважанымі. І таму ў 1955 годзе А. А. Скрабатун як лепшую з лепшых накіроўваюць на вучобу ў Мінск, у савецка-партыйную школу.

Пасля яе заканчэння жанчына па размеркаванню трапіла на Міёршчыну. Спачатку працавала на розных пасадах у райкоме партыі, райвыканкоме, а потым, у красавіку 1964 года, яе вылучылі старшынёй адсталага тады калгаса «Запаветы Леніна».

На ўсё жыццё, напэўна, запомніцца сход калгаснікаў. Прагаласавалі людзі за новага старшыню адзінадушна. Хацелася тады сказаць пра многае. Сказаць так, каб паверылі калгаснікі. Але не атрымалася, з цяжкасцю А. А. Скрабатун выдавіла звычайнае:

— Апраўдаю давер'е... Прыкладу ўсе сілы...

Вельмі хутка ўсе ўбачылі, што гэта былі не проста словы. Новы старшыня з душой узялася за работу. І хлебаробскую справу ведала нядрэнна, і душа ў яе была добрая, адкрытая, чулая да людскіх патрэб. Пацягнуліся людзі ў праўленне. Адзін нешта хоча параіць, другі сам просіць парады, трэці мяркуе пагаварыць са старшынёй пра свае асабістыя, сямейныя справы...

— Галоўнае ў нашай рабоце — гэта знайсці ключык да сэрцаў людзей, — дзеліцца сакрэтамі сваіх поспехаў А. А. Скрабатун. — Калі яны будуць бачыць, што ты іх паважаеш, ніколі не застанешся раўнадушнай да іх патрэб, то абавязкова пастараюцца адплаціць за клопаты ўдарнай працай. Гэта я добра засвоіла яшчэ ў маленстве ў доме сваіх бацькоў, які заўсёды быў гасцінна расчынены для кожнага, будзь гэта сусед ці выпадковы жабрак...

— А яшчэ я вялікую ўвагу ўдзяляла правільнаму падбору і расстаноўцы кадраў, — прадаўжае размову Алена Аляксееўна. — Яны ў калгасе «Запаветы Леніна» былі ўсе мясцовыя, як кажуць, дамарошчаныя. А таму і замацаваліся ў родных мясцінах на доўгія гады. Ды і маневраваць людзьмі, перакідваць іх з аднаго месца работы на другое я таксама не аматар. Лічу, што такая прывычка некаторых нашых кіраўнікоў акрамя шкоды нічога не прыносіць.

Ішлі гады. Багацеў, станавіўся заможным калгас. Калі ў пачатку працы А. А. Скрабатун у гаспадарцы ўраджайнасць зерневых складала ўсяго 6—7 цэнтнераў з гектара, то ўжо ў 1976 годзе на круг атрымалі каля 32 цэнтнераў збожжавых. Амаль у 10 разоў павялічылася за гэты час колькасць галоў буйной рагатай жывёлы і свіней. З'явіліся новыя будынкі майстэрняў, клуба, іншых вытворчых і сацыяльна-бытавых аб'ектаў. Ды і жылля для хлебаробаў з кожным годам сталі будаваць усё больш. Прычым стараліся, каб яно было не толькі прыгожае, але і зручнае, адпавядаючае ўсім сучасным патрабаванням.

Так, непазнавальна стала жыццё вяскоўцаў.

— Калі раней, бывала, у пачатку шасцідзесятых гадоў скажаш калгаснікам, што хутка ў дамах з'явіцца электрычнасць, то яны звычайна смяяліся: «Няпраўда, не цешце нас, Аляксееўна, казкамі». А ў сямідзесятыя гады не толькі святло, але і розныя бытавыя прыборы аблегчылі працу хлебаробаў, засвяціліся ў вокнах блакітныя агеньчыкі тэлевізараў.

Калгас «Запаветы Леніна» неаднаразова выходзіў пераможцам раённага сацыялістычнага спаборніцтва. З'явіліся ўрадавыя ўзнагароды на грудзях многіх яго лепшых працаўнікоў. Не абышла слава і старшыню гаспадаркі Алену Аляксееўну Скрабатун. Да ваенных медаляў дабавіліся ордэны «Знак Пашаны» і «Працоўнага Чырвонага Сцяга», а таксама ганаровыя граматы і значкі пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва.

Але ж час браў сваё. У 1982 годзе Алене Аляксееўне споўнілася 59. Трэба было і пра адпачынак падумаць. Пайшла на пенсію і пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў райцэнтр. Нялёгка было пакідаць гэтыя прыгожыя лясныя мясціны, дзе засталася часцінка сэрца, дзе прайшлі многія памятныя падзеі ў яе жыцці. Але што зробіш...

Нядоўга пабыла Алена Аляксееўна на пенсіі. Праз некалькі месяцаў ёй прапанавалі пасаду намесніка старшыні калгаса «Парыжская камуна». Згадзілася. І вось больш пяці гадоў яна на гэтай не менш клопатнай рабоце.

Добрая слава ідзе ў раёне пра калгас «Парыжская камуна». Ведаюць гэтую гаспадарку і за межамі Міёршчыны. І, вядома ж, пэўны ўклад у гэтым ёсць і А. А. Скрабатун, чалавека, якога любяць і паважаюць вяскоўцы за малады запал і працавітасць, уменне знайсці агульную мову і з ветэранам калгаснай вытворчасці, і з маладым механізатарам, які толькі што пачынае свой самастойны працоўны шлях.

Так, ведае сваю справу гэтая жанчына, умее і павесці іншых за сабой. Нездарма ж камуністы гаспадаркі аказалі ёй вялікае давер'е, выбраўшы сваім важаком.

— Наша Алена Аляксееўна — чалавек прынцыповы. Спуску гультаям і бракаробам не дасць. Хварэе за калгасную справу, як за сваю ўласную, — такое меркаванне членаў КПСС гаспадаркі пра свайго сакратара.

...А няўмольныя гады ўсё бягуць, пакідаючы маршчыны на твары, белізну на валасах. І як добра, што ўсё-такі не падуладна часу энергія, бадзёрасць, маладосць душы гэтай жанчыны. А таму Алена Аляксееўна, як і раней, нягледзячы на ўзрост, у працоўным страі.

Т. ГУГАЛА.



На здымку: намеснік старшыні калгаса «Парыжская камуна», сакратар партыйнай арганізацыі гаспадаркі Алена Аляксееўна Скрабатун.

З рэдакцыйнай пошты

Пасябравалі вайной

Есць у Перабродскім сельсавеце вёска Альхоўка. Жыве там толькі адзін чалавек — Паліна Антонаўна Глод. Гэта адзінокая і сталага ўзросту жанчына.

Амаль сорак гадоў мы сябруем і перапісваемся з Палінай Антонаўнай. Менавіта яна ў цяжкія гады ваеннага ліхалецця прадаставіла нам прытулак, хлеб, штодзённа сагравала нас цеплынёй свайго сэрца.

Зімой 1943—1944 гадоў мы для партызан вязалі свэтары, шкарпэткі, хадзілі па заданню ў Міёры, Браслаў.

Мы вельмі ўдзячны П. А. Глод за яе дабрату, чуласць, уважлівыя адносіны да людзей. Хацелася б пажадаць ёй моцнага здароўя. Нядрэнна, каб над гэтай жанчынай узялі шэфства цімураўцы з мясцовай школы.

Н. КАЗЛОВА.
в. Болдзіна Смаленскай вобласці.

Да свята

Вялікая падрыхтоўчая работа да свята 8-е Сакавіка праведзена работнікамі раённай бібліятэкі. Яны арганізавалі выстаўку «Ва ўсякай рабоце прыгожая, ва ўсякай рабоце лоўкая».

З. АЛЬХОЎКА,
дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

СНЯЦЦА ВОЧЫ

Гучыць урачыстая музыка. Зала раённага Дома культуры запоўнена. Сюды сабраліся жанчыны, чые сыны нясуць службу ў радах Савецкай Арміі. А яны, гэтыя жанчыны, цяпер не проста маці, яны салдацкія маці.

Адкрывае злёт вядучая Людміла Васільеўна Мірашнічэнка. Яна адрасуе цёплыя словы жанчыне-маці, якая дае чалавеку жыццё, выхоўвае яго, ставіць на ногі.

Уважліва слухаюць жанчыны выступленне ваенкома А. У. Тычко. Ён называе прозвішчы салдат, якія дастойна нясуць службу. Сярод іх — Юрый Мінчын з Міёр, Іосіф Арцімовіч з вёскі Орцы, Леанід Міхнёнак з Амбросенак, Генадзь Александровіч з Павяцця і іншыя.

Словы ўдзячнасці выказвае афіцэр жанчынам-маці, якія вырасцілі дастойных абаронцаў нашай Радзімы.

— Многа хат у раёне, у якіх чакаюць салдата, — працягвае вядучая. — Вось па вуліцы Свярдлова ў райцэнтры жывесям'я Варанцовых. Адсюль пайшоў на службу камсамолец Юрый.

— Пра сваіх дзяцей заўсёды нялёгка расказваць, — гаворыць маці Юрыя, Людміла Уладзіміраўна Варанцова, старшыня прафкома раённага вузла сувязі. — Наш сын рос працавітым, чулым хлопчыкам. Ніколі не дастаўляў нам непрыемных клопатаў. Добра вучыўся ў школе, з адзнакай закончыў тэхнікум. Служыць цяпер ён на Украіне. Шмат радасці было ў хаце, калі на некалькі дзён прыязджаў Юра ў водпуск. Нам прыемна было глядзець на яго, узмужнелага, дужага.

Пісьмо-падзяку атрымала сям'я Варанцовых ад камандавання: «Ваш сын — выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Карыстаецца заслужаным аўтарытэтам у к...